УДК [ 947.6 + 947.45 + 947.78 ] - 89 «1720/1730»

# РОД РАДЗІВІЛАЎ ВА ЎНУТРЫПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў 20 - ПАЧАТКУ 30-Х ГАДОЎ XVIII СТ.

***А.У.МАЦУК***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, г. Мінск)***

*Распавядаецца аб ролі рода Радзівілаў у палітычным жыцці Вялікага Княства Літоўскага ў 20 - пачатку 30-х гг. XVIII ст. Асноўная палітычная дзейнасць Радзівілаў была сканцэнтравана на справе спадчыны «нойбургскіх уладанняў». Таму Радзівілы супрацоўнічалі з каралём Аўгустам II і прыдворнай партыяй Чартарыйскіх. Вырашэнне на карысць Радзівілаў справы «нойбургскіх уладанняў» прывяла да перамены іх палітычных поглядаў, і яны далучыліся да ліку апазіцыі каралеўскай палітыцы ў Вялікім Княстве Літоўскім.*

Даследаванне ролі рода Радзівілаў ва ўнутрыпалітычным жыцці Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) у 20 - 30-я гг. XVIII ст. яшчэ чакае адпаведнага адлюстравання ў беларускай гістарыяграфіі. Пэўныя аспекты праблемы выкладзены толькі ў працах польскіх даследчыкаў: Ю. Барташэвіча, З. Анусіка, А. Страйноўскага, Е. Лясіньскага і Э. Раствароўскага [1 - 4]. Інфармацыя аб палітычнай дзейнасці Радзівілаў у гэты перыяд утрымліваецца і ў радзівілаўскіх персаналіях у «Польскім слоўніку біяграфічным».

Традыцыйныя лідэры палітычнага жыцця ВКЛ, Радзівілы, у 20-я гады XVIII ст. аказаліся ў другіх шэрагах магнатэрыі. Атрымалася так па некалькіх прычынах. Смерць у 1719 г. вялікага канцлера ВКЛ Караля Станіслава Радзівіла пазбавіла род палітычнага лідэра. Наваградскі ваявода Ян Радзівіл і яго брат Мікалай Фаўстын Радзівіл не мелі ні адпаведных здольнасцяў, ні вялікіх уладанняў, ні патрэбнай колькасці грошай для згуртавання вакол сябе значнай колькасці шляхты [2, с. 33]. Сыны Караля Станіслава Міхал Казімір і Іеранім Фларыян былі яшчэ занадта маладымі, каб стаць на чале роду. Ніхто з Радзівілаў на той час не займаў і значных пасадаў у ВКЛ, што таксама аслабляла іх пазіцыі ў параўнанні з іншымі магнацкімі родамі. У такой сітуацыі фактычным кіраўніком рода стала ўдава Караля Станіслава Ганна з Сангушкаў Радзівіл. У цэлым на працягу 20-х гг. XVIII ст. Радзівілы заставаліся на другіх ролях сярод магнатэрыі ВКЛ, таму былі вымушаны дзейнічаць не самастойна, а абапірацца на падтрымку прыдворнай партыі Чартарыйскіх, якія сталі набіраць моц менавіта ў гэты час.

Лідэры Фаміліі (назва групоўкі Чартарыйскіх і іх родзічаў) дакладна ацэньвалі сітуацыю Радзівілаў і разумелі, што на дадзены момант апошнія найбольш зацікаўленыя ў «нойбургскіх уладаннях»*. Інтарэсы ў праве спадчыны «нойбургскіх уладанняў» аб'ядналі ў адзіны саюз (немагчымы перад і ў час Паўночнай вайны) вялікага гетмана ВКЛ Людвіка Пацэя з яго шляхецкай кліентэлай і магнацкі род Сапегаў на чале з маршалкам ВКЛ Аляксандрам і стольнікам ВКЛ Юрыем. Апошнія абвясцілі свае прэтэнзіі на «нойбургскія ўладанні» як бліжэйшыя спадчынікі (праз Глябовічаў) біржанскіх Радзівілаў. Пацэю за падтрымку яны паабяцалі трэцюю частку ўсіх «нойбургскіх уладанняў». Перавага гэтага саюза над астатнімі родамі была відавочнай. Сведчыла пра гэта між іншым тое, што іх шляхецкія прыхільнікі мелі большасць на павятовых і ваяводскіх сойміках. Гэта дало саюзнікам магчымасць на працягу амаль дзесяцігоддзя кантраляваць выбары ў Трыбунал ВКЛ і прымаць там неабходныя ім судовыя рашэнні па справе «нойбургскіх уладанняў». Аднак з-за супраціву шляхты-пасэсараў саміх уладанняў і каралеўскай улады на практыцы ім не ўдавалася дабіцца выканання гэтых судовых рашэнняў і ўзяць уладанні ў сваё кіраванне [3, с. 125]. Сапегі, Агінскія і Пацэі знаходзіліся ў шэрагах апазіцыі каралеўскай уладзе ў ВКЛ. Таму Чартарыйскія падтрымалі ў працэсе за спадчыну «нойбургскіх уладанняў» менавіта Радзівілаў. Справа разглядалася ў Трыбунале ВКЛ і была ўнутранай справай княства. Але палітычныя погляды ўдзельнікаў працэсу Сапегаў, Агінскіх і Пацэяў ператваралі яго ў агульнадзяржаўны. Садзейнічала такому ператварэнню і дапамога Чартарыйскіх. Вядома, што С. Панятоўскі ўпершыню ў 1724 г. пачаў супрацоўнічаць з Радзівіламі падчас выбараў у Трыбунал ВКЛ і прапаноўваў, каб прадстаўнік іх роду заняў пасаду трыбунальскага маршалка. Вядома, што 22 лютага 1728 г. М. Чартарыйскі павіншаваў М.К. Радзівіла з выбарам дэпутатам на ковенскім сойміку [5, к. 233] і выказаў спадзяванне, што той стане і маршалкам Тр^буналу ВКЛ 1728 г. [6, к. 10]. М. Чартарыйскі абяцаў: «шчыра буду дапамагаць і ўсім нашым прыяцелям загадаю дапамагаць» М.К. Радзівілу пад час рэасумпцыі [6, к. 12]. Амаль адразу пасля соймікаў іншы лідэр Фаміліі падскарбі ВКЛ С. Панятоўскі пачаў перамовы з Л. Пацэем, каб той адмовіўся ад

* «нойбургскія ўладанні» - спадчына па біржанскай галіне Радзівілаў, якую пасля смерці Багуслава Радзівіла з-за адсутнасці ў яго сыноў атрымала ў спадчыну дачка Людвіка Караліна, якая выйшла другі раз замуж за нойбургскага князя Карла Філіпа.

падтрымкі прэтэнзіяў да трыбунальскага маршалкоўства віцебскага ваяводы [6, к, 11 - 12]. У выніку Л. Пацэй пацвердзіў Чартарыйскім, што падтрымае на пасаду трыбунальскага маршалка кандыдатуру Радзівіла [6, к. 14]. Канкурэнт Радзівіла М. Агінскі прасіў толькі, каб скарбавым маршалкам стаў рэчыцкі стараста К. Халецкі [7, к. 331]. Міхал Казімір не давяраў такім заявам і пажадаў, перш чым сустракацца з Л. Пацэем, сустрэцца і ўзгадніць план рэасумпцыі з С. Дэнгофам [7, к. 319]. Нягледзячы на заявы віленскага пісара, які казаў пра загад Л. Пацэя, каб «моцна ў інтарэсе князя (М.К. Радзівіла) працаваў», існавалі далейшыя падазрэнні, што вялікі гетман ВКЛ паспрабуе правесці абранне трыбунальскім маршалкам каго-небудзь трэцяга. Таму было вырашана даслаць усім дэпутатам яго лісты аб падтрымцы кандыдатуры Радзівіла Пацэем і іншымі магнатамі [7, к. 320]. У выніку на рэасумпцыі былі дапушчаны амаль усе дэпутаты пры чынным удзеле Радзівіла, які «пратэстуючых з дапамогай сваіх прыяцеляў угаворваў» [7, к. 332 - 334]. Такім чынам, умяшальніцтва Чартарыйскіх дапамагло Радзівілу пазбегнуць супрацьстаяння з Л. Пацэем. Аказалася, што Чартарыйскія як прадстаўнікі двара і прыдворнай партыі не маглі на роўных супрацьстаяць іншым магнацкім родам пад час выбараў на сойміках, але маглі ад імя караля дамагацца патрэбнага ім рашэння. Такім спосабам яны маглі ўплываць і на ўнутрыпалітычныя справы княства.

У тым жа 1728 г. памёр С. Дэнгоф, і Радзівілы згубілі свайго галоўнага саюзніка ў ВКЛ. Затое жаніцьба ў 1728 г. першага саксонскага міністра Я. Флемінга з Тэрэзай з Радзівілаў узмацніла сувязі Радзівілаў з каралеўскім дваром і Чартарыйскімі. Я. Флемінг дапамагаў Радзівілам у справе « нойбургскіх уладанняў» атрымаць падтрымку Аўгуста II і зрабіць так, каб Сапегі спазніліся з выкупам гэтых уладанняў [8, с. 45]. Самі «нойбургскія ўладанні» з 1714 г. знаходзіліся ў заставе ў караля Аўгуста II за 200 тысяч рэйнскіх злотых. Радзівілы гатовы былі выплаціць каралю сумму заставы «нойбургскіх уладанняў» на 20 талераў болып са 100 кожных талераў, чым Сапегі [8, с. 45].

Галоўнай перавагай Радзівілаў над Сапегамі і іх саюзнікамі ў справе «нойбургскіх уладанняў» была больш паспяховая знешнепалітычная дзейнасць. Ужо напачатку 20-х гг. XVIII ст. Радзівілы пачалі перамовы аб атрыманні ў заставу «нойбургскіх уладанняў». Рэйнскі электар Карл Філіп (другі муж дачкі Багуслава Радзівіла Людвікі Караліны) пагаджаўся на гэта, але пры ўмове, што Радзівілы заплоцяць тагачаснаму пасэсару Аўгусту II 100 тысяч талераў. Для сябе ён жадаў аплату каралеўскага доўга ў 100 тысяч талераў. Карл Філіп гіагаджаўся нават прадаць «нойбургскія ўладанні» ў спадчыну Радзівілам за 400 тысяч талераў (на яго думку, гэта раўнялася 20-гадоваму даходу з тых уладанняў). Такія ўмовы Радзівілы не жадалі прыняць, але адначасова сталі беспаспяхова старацца, каб Міхал Казімір ажаніўся з адной з унучак электара [9, к. 114 - 120]. Перамену ў стаўленні да Радзівілаў рэйнскага электара выклікалі падзеі ў ВКЛ. Сапегі, атрымаўшы некалькі станоўчых для сябе рашэнняў Трыбуналу, звярнуліся да караля пры пасрэдніцтве Л. Пацэя аб выкупе з заставы Аўгуста II «нойбургскіх уладаняў». Кароль не рашыўся супрацьстаяць адначасова Сапегам і Л. Пацэю напярэдадні сойма, дзе жадаў раздаць пасады гетманаў сваім прыхільнікам, і 7 лістапада 1729 г. пагадзіўся на сапежынскую прапанову [10, к. 173 - 174]. Карл Філіп аказаўся ў сітуацыі, калі цалкам мог страціць усе ўладанні ў ВКЛ. Ён беспаспяхова абяцаў даць на 50 тысяч рэйнскіх злотых болей, чым Сапегі [11, к. 27]. Каронны падканндер Я. Ліпскі прапанаваў «спосаб, якім электар мог бы бяспечна ўтрымаць у сваім доме тыя ўладанні». Ліпскі «не бачыў іншага бяспечнага, толькі каб электар якую-небудзь сваю ўнучку выдаў замуж у Польшчу». Найпрыдатнейшым кандыдатам сярод магнатаў Рэчы Паспалітай ён бачыў І.Ф. Радзівіла [11, к. 27]. Самі Радзівілы шукалі спосабы, каб прызнаць нелегальнасць гарадзенскай дамовы. Праўныя абставіны перадачы дапамаглі скіраваць шляхецкую незадаволенасць менавіта на апазіцыйных каралю Сапегаў. Праз Я. Ліпскага Аўгуст II супакойваў Радзівілаў, паказваючы, што можа і не выканаць дамову з Сапегамі: «з тых акалічнасцяў кароль не даў і не падпісаў пленіпатэнцыі камісарам, якія ад імя гетмана і Сапегаў складалі дамову ў Гародні і гэтае пагадненне не ратыфікаваў» [11, к. 27].

Паўплывала на пазіцыю Аўгуста II і падтрымка Карла Філіпа аўстрыйскім імператарам. «Венскі двор як гарант караля ў справе нойбургскіх уладаннях, і так блізка да гэтага дому прыналежны і сам князь нойбургскі электар за пункт гонару сабе закладае, каб кароль узяў грошы ад электара» [11, к. 27]. Акрамя абароны свайго гонару як гаранту дамовы, імператар напэўна меў і палітычныя меркаванні. Згодна з імі непажаданна было ўзмацняць пазіцыі французскіх прыхільнікаў у Рэчы Паспалітай Агінскіх і Сапегаў. Апошнія нават шукалі падтрымкі французскага першага міністра кардынапа Флеры [12, к. 7]. Таму Аўстрыя станоўча ставілася і да перамоваў Карла Філіпа з Радзівіламі, бо апошнія ў Рэчы Паспалітай садзейнічалі аўстрыйскім інтарэсам [352, с. 300].

Дапамог узмацненню Радзівілаў і кароль. 3 студзеня 1730 г., пасля смерці вялікага гетмана ВКЛ Пацэя, ён адмовіўся выканаць дамову з Сапегамі і падтрымаў прэтэнзіі Радзівілаў на «нойбургскія уладанні». Тыя знайшлі найбольш кароткі шлях, каб атрымаць іх. Яны дамовіліся з рэйнскім электарам Карлам Філіпам аб заручынах яго ўнучкі Францішкі і Іераніма Фларыяна. Згодна з дамовай яны яшчэ да вяселля атрымоўвалі ўладанні ў заставу [3, с. 126]. Радзівілы даволі хутка азнаёмілі з рашэннем рэйнскага электара аканомаў «нойбургскіх уладанняў» і ўступілі ў іх валоданне ў якасці пасэсараў [13, к. 208,

225, 227; 14, к. 73 - 74]. Такі крок аказалася магчымым зрабіць толькі пры падтрымцы Аўгуста II. Канчатковая дамова аб жаніцьбе Іераніма Фларыяна з унучкай Карла Філіпа Францішкай была заключана22 красавіка 1733 г. [304, с. 47]. Яшчэ раней, 28 красавка 1732 г., рэйнскі электар зацвердзіў дамову паміж Сапегамі і Радзівіламі [14, к. 92 - 93].

Такім чынам, смерць Л. Пацэя ўнесла значныя змены ва ўнутрыпалітычную сітуацыю ў ВКЛ. Агульнадзяржаўная апазіцыя трымалася ў асноўным на магнацкіх родах Агінскіх, Сапегаў і Б. Гансеўскага. Л. Пацэй прымаў у яе дзейнасці абмежаваны ўдзел, і яго смерць прывяла толькі да некаторага карэктавання пазіцыяў і дзеянняў апазіцыі каралеўскай палітыцы. Для ВКЛ яго смерць мела вялікае значэнне. Яна аслабіла пазіцыі Сапегаў у справе атрымання «нойбургскіх уладанняў». Апошнія былі вымушаныя шукаць новых саюзнікаў, і іх выбар прыпаў на Агінскіх, якія таксама праз спадчыну па Глябовічах мелі прэтэнзіі да «нойбургскіх уладанняў». Агінскія дамовіліся аб супольных дзеяннях з Сапегамі супраць падтрыманых каралём Радзівілаў. Адпаведна і ў палітычным жыцці ВКЛ яны разам з Сапегамі занялі антыкаралеўскую пазіцыю [15, к. 1 - 3; 16, с. 564; 17, с. 50].

Рэасумпцыя Трыбуналу ВКЛ павінна была стаць кульмінацыйным момантам супрацьстаяння паміж Сапегамі і Радзівіламі за «нойбургскія ўладанні». Перамогу на рэасумпцыі атрымалі Сапегі, і іх кандыдат Еперыяш стаў трыбунальскім маршалкам. Так адбылося, бо «віленскі ваявода з цэлым сваім Домам, які паказваў дасюль як бы абыякавасць і заўсёды заяўляў, што былібы паказаны слушныя на Еперыяша судовыя рашэнні, то адашле яго пад ласку, сёння паказаўся яўным непрыяцелем, бо на некалькі дзесяткаў судовых рашэнняў, на так шмат пратэстацыяў, не на што не звярнуўшы ўвагі, чатыры гадзіны ўтрымліваў Еперыяша. Гвалтам загадаў яму прысягаць і добра падсудак і віленскі земскі пісар адазваліся, што на іх думку трэба, каб Еперыяш пайшоў пад ласку. Ваявода адазваўся, а мае́ такое, каб прысягнуў. Віцебскі ваявода тое, таксама, падтрымаў, кінуўшыся да шаблі на пісара, а абозны без цэрымоній, хацеў яго ўдарыць у лоб шабляй, калібы мінскі стараста не ўтрымаў, пабачыўшы, які гвалт права Князі Ягоімасць, навааградскі ваявода, князь крайчы, князь Удальрык выйшлі з маніфестацыяй супраць такіх вялікіх парушэнняў, а за імі са сто шляхты, але тое нічога не дапамагло. Віленскі ваявода ўсіх прыяцеляў нашых з-за вымышленных прычынаў пад ласку адаслаў, а сваім Еперыяша казаў абраць маршалкам» [7, к. 461 - 462]. Дадзеныя падзеі пацвярджаюць іншыя крыніцы [18, л. 270 - 271]. Такія дзеянні К. Агінскага былі даволі нечаканымі для Радзівілаў, бо незадоўга да Трыбунала ён абяцаў ім сваю падтрымку ў недапушчэнні Еперыяша да трыбунальскага кола [7, к. 457 - 458]. Праўда, было вядома, што амаль адначасова звярталіся да яго і Сапегі [7, к. 458]. Праводзіліся Радзівіламі перамовы з абозным ВКЛ і віцебскім ваяводай [7, к. 456, 460]. Апошні нават ноччу на спатканні з М.К. Радзівілам абяцаў, што не падтрымае кандыдатуру Еперыяша і пытаў «каго Ягомасць жадае, каб быў маршалкам» [7, к. 353]. Па іншай інфармацыі, ён настойваў, каб гэтым іншым быў не радзівілаўскі кандыдат Дамброўскі [18, л. 270]. Віленскі ваявода зрабіў так, бо «ад полацкай ваевадзянкі ўзяў трыццаць тысяч, а ад Сапегаў запіс на Дуброўна на 100 тысяч» [7, к. 462]. Падкупіла ваевадзянка і віцебскага ваяводу, а абознаму ВКЛ абяцала выйсці за яго замуж [7, к. 462 - 463]. Акрамя таго, яна даслала на абарону Еперыяшу некалькі дзесяткаў грэнадзёраў [7, к. 453; 18, л. 270], а таксама выдала значныя сумы грошай і на подкуп дэпутатаў [7, к. 354]. Па іншых звестках, рабіла тэта як яна, так і віленскі ваявода [19, с. 122]. Такім чынам, найбольш карыснай для Сапегаў аказалася падтрымка полацкай ваевадзянкі і Агінскіх. Дапамогу апошніх вельмі высока ацаніў А.К. Сапега і прасіў М.А. Сапегу напісаць лісты да Агінскіх з падзякай ад імя ўсіх Сапегаў [20, к. 127]. Падтрымалі Сапегаў віленскі і смаленскі біскупы [7, к. 458], а таксама А.Пацэй, Хараін, А.Пшэздзецкі і купіскі стараста [20, к. 128]. Падтрымка Радзівілаў віленскім земскім пісарам тлумачылася яго абяцаннямі, дадзенымі сакрэтна ноччу М.К. Радзівілу [7, к. 453]. Да ўсіх непрыемнасцяў Радзівілаў далучыўся і непаразуменні з адным з лідэраў Фаміліі М. Чартарыйскім, які выгаворваў М.К. Радзівілу, што той падчас рэасумпцыі Трыбуналу ВКЛ разам са «сваім домам» спрабаваў утрымаць «псеўдаабраных дэпутатаў» [6, к. 32].

Сапегі, атрымаўшы перавагу ў Трыбунале, адхілілі ад пасады віленскага пісара Савіцкага і абралі на яго месца віленскага дэпутата Манкевіча [20, к. 127 - 128]. Савіцкі ў падзяку за свае дзеянні падчас рэасумпцыі павінен быў адтрымаць ад караля пры пасрэдніцтве Чартарыйскіх пасаду мсціслаўскага ваяводы [21, к. 3]. Адначасова радзівілаўскі прыхільнік Белазор саступіў маршалкоўства скарбавага Трыбуналу сапежынскаму прыхільніку палкоўніку Дамаслаўскаму [20, к. 130]. Галоўным было тел;, што яны дамагліся для сябе прыняцця чатырох судовых рашэнняў, згодна з якімі атрымоўвалі «нойбургскія ўладанні». Не ўдалося, праўда, атрымаць такія ж рашэнні наконт уладанняў на рускай кадэнцыі, бо прэтэндэнт на іх М.А. Сапега з'яўляўся віленскім дэпутатам [20, к. 147, 150]. Яго бацька, маршалах ВКЛ, пакрыўджаны на старэйшага сына Казіміра Леона, перадаў у жніўні 1731 г. яму ўсе свае правы на «нойбургскія ўладанні» Міхалу Антонію [20, к. 127].

Сапегі, заўважыўшы, што могуць страціць «нойбургскія ўладанні», вырашылі заняць іх з дапамогай зброі [4, с. 217; 16, с. 564; 17, с. 51; 22, с. 20]. Яны пачалі набіраць людзей для выканання трыбунальскіх рашэнняў. Тэта былі значныя сілы, якія маглі прывесці да грамадзянскай вайны ў ВКЛ. Дастаткова ска-

заць, што 20 жніўня 1731 г. А.К. Сапега: «маім уласным коштам маю гатовае Віленскае ваяводства пад камандай віленскага харунжага Вольскага, з якім будзе 60 адборнай шляхты кожны з почтай, тэта значыць 120 коней, кожнаму па 100 тынфаў шляхціпу даў, а харунжаму 500 тынфаў. Татараў 100.
З Віленскага і Троцкага ваяводстваў у добрым парадку сабраў надворную харугву» (65 чалавек). «Рэйтары надворнай вельмі добрай, лоеўскіх стральцоў некалькі соцень разам з рэчыцкім старастам Халецкім і мсціслаўскім падкаморыям Валовічам, якія загадалі сваім стральдам злучыцца з маімі» [20, к. 113-114]. Прычым гэта быў не галоўны сапежынскі атрад. Галоўны павінен быў напасці на Слуцк і збіраўся пад Ляхавічамі [20, к. 120 - 121].

Але палітычная эліта ВКЛ непрыязна ставілася да планаў Сапегаў [20, к. 123]. Аўгуст ІІ пасля няўдалых спробаў пераканаць Еперыяша і трыбунальскіх суддзяў не разглядаць справу «нойбургскіх уладанняў» на Трыбунале [23, к. 249 - 254], даведаўшыся пра магчымасць захопу «нойбургскіх уладанняў» Сапегамі, загадаў сваім лістом ад 16 красавіка 1731 г., каб М. Вішнявецкі абараніў іх «людзьмі вайсковымі пад камандай вашай будучымі» [19, с. 119 - 120]. Такім чынам, аблозе «нойбургскіх уладанняў» Сапегамі перашкодзіла ўмяшальніцтва Аўгуста ІІ, які пад пагрозай прымянення каронных войскаў прымусіў Сапегаў адмовіцца ад ужывання сілы і сесці за стол перамоваў [4, с. 220]. Сапегі не адступілі ад свайго плана і час ад часу з'яўляліся чуткі пра іх магчымы напад на «нойбургскія ўладанні» [19, с. 120].

Да наступнага Трыбуналу ВКЛ Радзівілы падрыхтаваліся лепей. Кіраваў усёй кампаніяй М. Вішнявецкі. Істотнай праблемай быў недахоп грошай у Радзівілаў: «Ёсць некалькі дзесяткаў таварышаў, якія ахвяруюць у гэтым інтарэсе па ваяводствах служыць, а кожны жадае ўзяць неменш тысячы злотых» [7, к. 394 - 395]. Быў складзены план выбараў на грамнічых сойміках. Згодна з ім, у Троках выбар дэпутатаў быў арганізаваны мясцовы земскі пісар. Трэба было сарваць соймік, калі кандыдатамі на дэпутата будуць асобы, варожыя радзівілаўскім інтарэсам [7, к. 374]. У Гродна быў пасланы наглядаць за мясцовым соймікам Ельскі [7, к. 380]. На ім жа абяцаў служыць інтарэсам Радзівілаў і мясцовы харунжы Барановіч [7, к. 376, 381]. Праводзіў М.К. Радзівіл і вялікую нараду з наваградскім кашталянам А. Аскеркай адносна надыходзячых соймікаў [7, к. 477 - 478]. Не вельмі даверыралі Радзівілы вількамірскаму старасце Францкевічу і прасілі толькі аб іх дапамозе на сойміках [7, к. 478]. У Вільню быў пасланы Дылеўскі і напісаныя лісты з просьбамі дапамагчы на мясцовых сойміках Храпавіцкаму і Ваўку. Галоўны мясцовы радзівілаўскі прыхільнік лоўчы ВКЛ быў хворы і нічым не мог дапамагчы Радзівілам [7, к. 380]. Ён якраз і павінен быў кантраляваць выбары на віленскім, смаленскім і старадубаўскім сойміках [7, к. 387]. На іх павінныя былі дапамагчы Радзівілам рэферэндары ВКЛ, старадубаўскі харунжы і Петрусевіч [7, к. 387]. Забяспечаны былі выбары ў Віцебску, Полацку, Браславе, Оршы і Мсціславе [7, к. 380]. Дапамагаць на іх, напэўна, павінен быў радзівілаўскі губернатар Невеля Пяскоўскі, які павінен быў у выпадку абрання «варожых слуцкім інтарэсам дэпутатаў» сарваць дэпутацкія соймікі ў Полацку, Оршы, Віцебску і Ашмянах [19, с. 125]. З гэтай мэтай ён вёў у Горках перамовы з брэсцкім кашталянам В. Жабай і старадубаўскімі ўраднікамі [19, с. 125]. В. Жаба абяцаў наглядаць за выбарамі ў Полацку. Дапамагчы павінны былі і мясцовыя радзівілаўскія прыхільнікі - род Войнаў [7, к. 390 - 391]. На Віцебскім сойміку абяцалі адстойваць радзівілаўскія інтарэсы некалькі шляхціцаў. Асабліва карыснай была падтрымка Шульборскага, але існавала сумненне ў іх адданасці Радзівілам [7, к. 391]. Павінны былі сачыць за выбарам на сойміках і імкнуцца быць абранымі Пішчала і шляхецкі род Лышкоўскіх [7, к. 391]. Тое самае павінен быў рабіць і Сухадольскі [7, к. 391]. Шмат турбот выклікаў соймік у Браславе, дзе радзівілаўская партыя жадала, каб дэпутатам быў абраны Ваўжэцкі, а «калі немагчыма, каб сарвалі соймік, бо абозны ВКЛ адтуль жадае сабе быць дэпутатам». Апошні нават пісаў лісты да браслаўскага падкаморыя і іншых шляхціцаў з просьбай аб падтрымцы сваёй кандыдатуры [7, к. 389]. У Пінску збіраўся выехаць і балатавацца на мясцовым сойміку сам М. Вішнявецкі [7, к. 395]. У Слоніме павінен быў сачыць за соймікам Златкоўскі, а ў Лідзе - лідскі стольнік Шышка [7, к. 391,395]. Тут жа змагаўся за дэпутацтва стражнік ВКЛ А. Пацэй, але радзівілаўскія прыхільнікі смаленскі кашталян і лідскі стольнік, збіраліся перашкодзіць яго абранню [7, к. 388]. Аб Ашмяне «не трэба сумнявацца, але тое мне каштуе» [7, к. 388]. У Вількаміры лічылі, што неабходна, каб кіраўнік радзівілаўскіх прыхільнікаў, вількамірскі маршалак, узгадніў план выбараў на сойміку з мясцовым старастай. Радзівілаўскі пленіпатэнт Златкоўскі праводзіў кансультацыі і з вількамірскім харунжым і з Пяткевічам [7, к. 388]. У Троках пры падтрымцы падканцлера ВКЛ радзівілаўскія прыхільнікі жадалі, каб за дэпутацтва змагаўся Таруса [7, к. 389]. У Коўне было вядома, што дэпутатамі будуць мясцовыя шляхціцы [7, к. 389]. У Упіце меркавалі пры падтрымцы мясцовых старасты і маршалка правесці выбар упіцкага стольніка Белазора [7, к. 390]. Златкоўскі лічыў, што Радзівілам не трэба турбавацца наконт выбараў у Пінску, Слоніме і Ваўкавыску [7, к. 390]. У Жмудзі павінен быў абрацца радзівілаўскі прыхільнік, жмудскі харунжы, які павінен быў пагадзіцца ў гэтай справе з Нагурскім [7, к. 390]. У Рэчыцы не трэба было апасацца рэчыцкага старасты Халецкага, бо павінны былі забяспечыць патрэбны выбар Кельчэўскія [7, к. 392]. У Мазыры за соймік адказваў наваградскі кашталян [7, к. 393]. За мінскім соймікам павінен быў наглядаць Грымайла [7, к. 393].

Сапегі таксама разгарнулі актыўную дзейнасць перад грамнічымі соймікамі, А.К. Сапега заяўляў Ю.Ф. Сапегу, што патрэбна лепей падрыхтавацца да выбараў на грамнічых сойміках і забяспечыць больш шырокае прадстаўніцтва, чым на папярэднім Трнбунале. Сам Антоні Казімір выязджаў на мазырскі і рэчыцкі соймікі, на якіх меў шмат прыяцеляў [20, к. 151 - 152]. Ён спадзяваўся, што і на наваградскім сойміку будуць абраныя сапежынскія прыхільнікі - наваградскі канюшы Есман і наваградскі войскі Вайніловіч [20, к. 153]. Сапежынскі стаўленік, троцкі стольнік Давойна, збіраўся балатавацца ў Троках [20, к. 148]. Антоні Казімір засцерагаў, што сапежынскія прыхільнікі будуць мець праблемы на мінскім і слонімскім сойміках [20, к. 148]. Лічыў неабходным уважліва сачыць за выбарамі на пінскім сойміку [20, к. 149].

Іншыя сапернікі Радзівілаў, Агінскія, на пачатку 1732 г. з'ехаліся на радавую нараду каля Гродна і прасілі дапамогі для іх і Сапегаў з боку гарадзенскага старасты М. Масальскага. Той адмовіўся іх падтрымаць. Адмова Масальскага, напэўна, тлумачылася яго супрацоўніцтвам з Фаміліяй, якая прыхільна ставілася да прэтэнзіяў Радзівілаў на «нойбургскія ўладанні». Напачатку 1732 г. назіралася непаразуменне і ўнутры роду Радзівілаў. Так, наваградскі ваявода быў пакрыўджаны адмовай М. Вішнявецкага падтрымаць кандвдатуру Удальрыка Радзівіла на пасаду лоўчага ВКЛ [7, к. 372 - 372]. Фамілія дапамагала Радзівілам на сойміках, а таксама і забяспечвала пратэкцыю двара. С. Панятоўскі нават спецтльна распаўсюджваў чуткі пра знаходжанне М.К. Радзівіла ў Воўчыне, каб пераканаць Сапегаў і Агінскіх у існаванні саюза паміж Чартарыйскімі і Радзівіламі [7, к. 395]. Іншы лідэр Фаміліі, М. Чартарыйскі 22 мая 1732 г. павіншаваў М.К. Радзівіла з тым, што маршалкам Трнбунала ВКЛ быў абраны М. Вішнявецкі [6, к. 46]. У канцы ліста ён заяўляў, што назаўжды жадае разам са сваёй Фаміліяй заставацца ў саюзе з Радзівіламі [6, к. 46]. Такім чнна, у 1732 г. узмацнілася супрацоўніцтва паміж Радзівіламі і Чартарыйскімі. Дапамога апошніх дапамагала Радзівілам на некаторых сойміках (гарадзенскі) і забяспечвала падтрымку каралеўскага двара.

У выніку Радзівілы атрымалі перавагу на грамнічых сойміках. М. Вішнявецкі быў абраны дэпутатам у Пінску і стаў найбольш рэальным прэтэндэнтам на пасаду трыбунальскага маршалка. Але запратэставалі некалькі соймікаў, якія выступалі супраць выбрання маршалкам Тр^бунала асобы, якая займала міністэрскую пасаду. Радзівілы настойвалі на адваротным і накіравалі ў Вільню значныя вайсковыя аддзелы і сваю шляхецкую кліентэлу. Сапегі не збіраліся адступаць, і рэасумпцыя Тр^бунала ВКЛ ізноў магла адбыцца ў сітуацыі супрацьстаяння. Найбольш непажаданым для Аўгуста II быў канфлікт у ВКЛ. Ён апасаўся, каб той неператварыўся ў агульнадзяржаўны выступ апазіцыі, таму дамогся пры пасрэдніцтве пр^маса Т. Патоцкага перамоваў 8 сакавіка 1732 г. у Варшаве паміж Радзівіламі і Сапегамі ў справе «нойбургскіх уладанняў». Перамовы скончыліся 5 красавіка 1732 г. дамовай, па якой Сапегі адмаўляліся ад сваіх правоў на «нойбургскія ўладанні» за суму 2 мільёны чырвоных злотых, чым страчвалі свае палітычныя і эканамічныя пазіцыі ў ВКЛ і значна ўзмацнялі пазіцыі Радзівілаў [14, к. 78; 24, к. 2 - 3]. Больш за ўсіх выйграў каралеўскі двор, які, адыграўшы ролю пасрэдніка, аслабіў апазіцыю ў ВКЛ і ўмацаваў пазіцыі прыхільных да сябе Радзівілаў.

Такім чынам, можна зрабіць некаторыя высновы пра супрацоўніцтва паміж Радзівіламі і Чартарыйскімі падчас панавання Аўгуста II. Асновай супрацоўніцтва было добрае ўсведамленне лідэрамі абедзвюх груповак, што паасобку яны не ў стане супрацьстаяць ні аб'яднаным сілам апазіцыі, ні нават адной пацэеўскай ці сапежынскай групоўцы. Чартарыйскія пры гэтым былі больш зацікаўлены ў супрацоўніцтве падчас выбараў на пасольскіх сойміках ВКЛ, каб перашкодзіць абранню прадстаўнікоў апазіцыі. Радзівілы таксама бачылі карысць супрацоўніцтва ў час выбараў на дэпутацкіх сойміках, бо супрацьстаялі на іх Сапегам, Агінскім і Пацэям у кантэксце змагання за «нойбургскія ўладанні». Вырашэнне гэтай праблемы прывяло і да перамены стаўлення Радзівілаў да падтрымкі прыдворнай групоўкі Чартарыйскіх і палітыкі Аўгуста II.

Дапамагла Радзівілам і ўдалая знешнепалітычная дзейнасць, якая таксама праводзілася пры падтрымцы двара. Радзівілам удалося заключыць дамову з рэйнскім электарам і забяспечыць пратэкцыю аўстрыйскага імператара. Такім чынам, можна казаць пра пэўныя асаблівасці пазіцыі Радзівілаў у адносінах да замежных краін, у параўнанні з іншымі магнацкімі групоўкамі ў ВКЛ. Радзівілы не падтрымоўвалі актыўных кантактаў з асноўнымі знешнепалітычнымі гульцамі ў княстве: Францыяй і Расіяй. Выклікана тэта было іх занятасцю ў асноўным справай «нойбургскай спадчыны». Таму асноўныя кантакты іх абмяжоўваліся дзяржавамі, якія мелі адносіны да гэтага пытання. Наладжванню супрацоўніцтва з Францыяй перашкаджала і пазіцыя апошняй па падтрымцы Сапегаў і Агінскіх. Праўда, французскі пасол А.Ф. Манці лічыў справу «нойбургскіх уладанняў» нявартай пільнай увагі і не жадаў распальвання ўнутрыпалітычнага канфлікту з-за яе [4, с. 217].

Такім чынам, можна зрабіць пэўныя высновы наконт ролі Радзівілаў ва ўнутрыпалітычным жыцці ВКЛ у 20 - пачатку 30-х гг. XVIII ст. Асноўная палітычная дзейнасць роду Радзівілаў у тэты час была сканцэтравана на справе спадчыны «нойбургскіх уладанняў». Радзівілы самастойна былі не ў стане супрацьдзейнічаць іншым прэтэндэнтам (Сапегі, Агінскія, Пацэі) на «нойбургскія ўладанні» і таму супрацоўнічалі з прыдворнай партыяй Чартарыйскіх. Апошнія якраз у 20-х гг. XVIII ст. пачалі сваё

ўзвышэнне ў Рэчы Паспалітай, У ВКЛ сваю дзейнасць Фамілія пачала з 1723 г. Яна была не ў стане самастойна супрацьстаяць апазіцыі каралеўскай палітыцы, якая складалася ў княстве з уплывовых родаў Сапегаў, Агінскіх і Пацэяў. Таму Фамілія таксама была зацікаўлена ў саюзніках. Натуральна, што імі сталі Радзівілы, якія змагаліся з тымі ж Сапегамі, Агінскімі і Пацэямі з-за «нойбургскіх уладанняў». Фактычна склалася сітуацыя, калі Радзівілы сталі дапамагаць прыдворнай партыі Чартарыйскіх, бо былі зацікаўлены ў дапамозе апошніх у справе «нойбургскай спадчыны». У выніку яны атрымалі «нойбургскія уладанні», а таксама неабходную дапамогу ад Аўгуста II для абароны супраць збройнага нападу на гэтыя уладанні Сапегаў. Вырашэнне кансэнсусам на карысць Радзівілаў справы «нойбургскіх уладанняў» прывяла да перамены іх палітычных поглядаў, і яны далучыліся да ліку апазіцыі каралеўскай палітыцы ў Вялікім Княстве Літоўскім.

## ЛІТАРАТУРА

1. Bartoszewicz J. Zamek Bialski. - Lwów, 1881.-218 s.
2. Anusik Z., Stroynowski A. Radziwiłłowie w epoce saskiej. Zarys dziejów politycznych i majątkowych // Acta Universitatis Lodziensis. Folia Historica 33. - 1989. - S. 29 - 58.
3. Lesiński J. Spory o dobra neuburskie // Miscellanea Historico-Archivistica, 1996. T. 6. - S. 95 - 132.
4. Rostworowski E. O polska koronę. Polityka Francji w latach 1725 - 1733. - Wrocław - Kraków: Ateneum, 1958 - 364 s.
5. AGAD, Archiwum Radziwiłłów, dział VI, koperta 80a.
6. AGAD, Archiwum Radziwiłłów, dział V, nr 2579/1.
7. Archiwum Radziwiłłów, dz.V, 18782.
8. Karkucińska W. Anna z Sanguszków Radziwiłłowa. - Warszawa: Semper, 2000. - 391 s.
9. AGAD, Archiwum Radziwiłłów, dział XI. - S. 120.
10. Biblioteka PAN PAU sygn. 294.
11. AGAD, Archiwum Radziwiłłów, dział IVa, teka 13, koperta 2.
12. Biblioteka Ossollińskich 2681.
13. AGAD, Archiwum Radziwiłłów, dział XXШ, teka 119 plik 4.
14. AP, oddział na Waweliu, Archiwum Młynowski Chodkiewiczów nr 222.
15. Biblioteka PAN PAU sygn. 5838.
16. Rachuba A. Sapieha Aleksander Paweł // Polski Słownik Biograficzny, t. XXXIV, cz. 4, zeszyt 143, Wrocław - Warszawa - Kraków, 1993. - S. 563 - 564.
17. Rachuba A. Sapieha Kazimierz Leon Karol // Polski Słownik Biograficzny, t. XXXV, cz. 1, zeszyt 143, Wrocław - Warszawa - Kraków, 1994. - S. 50-51.
18. РНБ, Автографы Дубровского № 124.
19. Pamiętnik Felicyana Junoszy Piaskowskiego podstolego podlaskiego, majora J.K. Mości, począwszy od roku 1690. - Lwów: Nakładem K. Jabłonowskiego, 1865. - 131 s.
20. AGAD, Archiwum Roskie, t. II Korespondencja, LV/18.
21. AGAD, Archiwum Tyzenhauzów G-300.
22. Rachuba A. Sapieha Kazimierz Jerzy Stanisław // Polski Słównik Biograficzny, t. XXXV, cz. 1, zeszyt 143, Wrocław-Warszawa-Kraków, 1994.-S. 18-22.
23. Biblioteka Czartoryskich 209.
24. AGAD, Archiwum Radziwiłłów, dział XXIII, teka 120, plik 2.